Кастерев Качан







# Кастусь Качан

жывапіс painting живопись

# Kastuś Kačan






Мінск
«БЕЛАРУСЬ»
2019

УДК 75(476)(084.1)
ББК 85.143(4Беи)Я6
К30

Укладальнік
К. І. Качан

Аўтар уступнага артыкула доктар мастацтвазнаўства
В. І. Жук

Фота:
З. Герасімовіч, Д. Казлоў, І. Качан, Я. Коктыш, А. Спрынчан, з асабістых архіваў аўтара

Аўтар шрыфтавога лагатыпа на вокладцы У. Лукашык

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ISBN 978-985-01-1294-1

© Качан К. І., укладанне, 2019
© Жук В. І., уступны артыкул, 2019
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2019

Пейзажны жывапіс займае важнае месца ў мастацкай культуры Беларусі XX ст. Прырода ў мастацтве заўсёды адносілася да сферы ідэалаў, з'яўлялася крыніцай нацыянальнай самабытнасці. Менавіта прырода аказвае вырашальнае ўздзеянне на мастацкую свядомасць, на стаўленне да традыцыі, уплывае на стылістыку беларускага мастацтва. Прыгажосць прыроды, архітэктура гарадоў, мястэчак, вёсак ужо на працягу цэлага стагоддзя натхняюць мастакоў і шмат у чым вызначаюць складанне спецыфічных рыс пейзажнага жывапісу Беларусі.

Пейзаж — гэта заўсёды мастацкі вобраз прыроды, яе пэўная інтэрпрэтацыя, неаддзельная як ад стыляў, пануючых у мастацтве, так і ад поглядаў на прыроду і месца чалавека ў ёй, якія характарызуюць эпоху. У цэнтры філасофіі пейзажа заўсёды стаіць пытанне аб дачыненні чалавека да навакольнага асяроддзя — горада або вёскі, — і філасофскае напаўненне пейзажнага вобраза вызначае яго жывапісныя сродкі. У жанры пейзажа знаходзяць адлюстраванне як мастацкія, так і сацыяльна-палітычныя ідэі і ідэалы, якія пануюць у грамадстве. Яны выяўляюцца ў выбары пейзажнага матыву, мастацкім ажыццяўленні тэмы, нарэшце, нават у выбары назвы твора. І, што не менш важна, пейзаж, як мала які іншы жанр, неаддзельна звязаны з асаблівасцямі нацыянальнага менталітэту.

У XX ст. мастацкую традыцыю творча развілі такія жывапісцы, як С. Жукоўскі, В. Бялыніцкі-Біруля, Ф. Рушчыц, М. Дучыц, М. Тарасікаў, С. Каткоў, Д. Алейнік, А. Бараноўскі, А. Бархаткоў, Г. Вашчанка, В. Грамыка, П. Масленікаў, І. Рэй, У. Сулкоўскі, К. Харашэвіч, В. Цвірка, Л. Шчамялёў і інш. Да пачатку XXI ст. беларускі пейзажны жывапіс дасягнуў свайго росквіту, склаўшыся ў яркую самабытную з'яву. У наш час пейзаж, магчыма, самы любімы, папулярны і запатрабаваны жанр у выяўленчым мастацтве, да якога на тым ці іншым этапе свайго творчага шляху звяртаецца большасць беларускіх мастакоў.

Пейзажы пішуць многія творцы, але далёка не ўсіх можна з поўным правам назваць пейзажыстамі. Кастусь Качан валодае адной з найважнейшых для гэтага якасцей — пейзажным мысленнем. Ён любіць прыроду бескарысліва, менавіта яна аказвае вырашальнае ўздзеянне на яго мастацкую свядомасць, на стаўленне да традыцыі, уплывае на стылістыку яго твораў. Крыніцай нацыянальнай самабытнасці мастака з'яўляецца разнастайнасць беларускіх ландшафтаў. Аналіз развіцця пейзажнага жанру дае ўсведамленне таго шляху, па якім ішло станаўленне жывапісу Кастуся Качана як у яго фармальных праявах, так і ў светапоглядных асновах, паколькі ў пейзажах закладзены нацыянальны характар беларусаў, увасоблена душа народа.

Пейзаж — гэта жанр станковага жывапісу, у якім галоўным прадметам выяўлення выступае натуральная або пераўтвораная чалавекам прырода. Як спосаб спасціжэння рэальнасці ён складаецца з арганічнага зліцця пачуццёвага і інтэлектуальнага пачаткаў. Яго праява ў адзінстве настрою і пачуцця мастака з веданнем і вопытам знаходзіць сваё выражэнне ў эцюдзе, эцюдзе-карціне, пейзажы-карціне. Пры гэтым пейзаж можа ўяўляць сабой партрэт якога-небудзь ландшафту, акцэнтаваць стан прыроды па пары года і сутак, выказваць праз пэўны матыў прыроды чалавечы настрой, разважанне.

Доўгі час індустрыяльны, урбаністычны пафас панаваў на палотнах, якія дэманстраваліся на выставах. Цяпер, як рэакцыя на былы тэхніцызм XX ст., адзначаецца цяга да першароднай прыгажосці навакольнага свету, да яго ціхіх, поўных паэзіі і прыгажосці куткоў. Кастусь Качан, як і многія мастакі, звяртаецца да найбольш традыцыйнай формы пейзажа — выяве прыроды ва ўсёй яе натуральнай праўдзе, свабодзе і гармоніі. Асабліва актуальным пейзаж аказаўся на рубяжы XX—XXI стст., калі ўсё больш відавочным стаў крызіс кампазіцый на сацыяльна значную тэму, гіпербалізавана пампезных карцін для юбілейных афіцыйных выставаў. Для адных стварэнне пейзажа — гэта сакрамант, пошук заключанай у прыродзе гармоніі быцця, якая ў меру сіл і таленту ўвасабляецца на палатне. Іншыя гатовыя ўслухоўвацца ў павольны рост дрэў і траў, шорах лістоты і трапяткое мігценне святла, якое дае магчымасць адчуць сваё дачыненне да жыцця прыроды.

Кастусь Качан стаў мастаком дзякуючы сваёй здольнасці адчуваць і здзіўляцца велічы і магічнай прыцягальнасці прыроды. З аднаго боку, пейзаж для яго — гэта сродак даць адпачынак і заспакаенне, адвесці ў свет паэтычнай мары. Але з іншага боку, з дапамогай пейзажа мастак заклікае нас звярнуць увагу на прыгажосць пор года, мігцення снегу, квітнеючых дрэў, восеньскай лістоты, бязмежнага абсягу палёў, таямнічага жыцця лясоў і цячэння рэк, ціхіх будняў правінцыйнага горада. Чалавек і прырода — гэта тыя гармонія і цэласнасць жыцця, да выказвання якіх імкнецца ў сваёй творчасці мастак Кастусь Качан.

Традыцыйна шанаваны ў нас пейзажны жанр стаў у апошняе дзесяцігоддзе, мабыць, самым папулярным. Канец XX ст. быў багаты на падзеі часам катастрафічныя і непрадказальныя. У пэўнай ступені і шырокі зварот да пейзажа тлумачыцца стомленасцю ад нястрымнай жыццёвай мітусні, расчараванасцю ў сацыяльных міражах, своеасаблівым крызісам, які перажывае мастацтва і эпоха ў цэлым. Пейзажны жывапіс культывуе асаблівую практыку сузірання, ён як нішто іншае дапамагае ўсталёўваць адносіны з навакольным светам і ў гэтай сваёй якасці не перажывае змен.

Пейзажны жанр самым непасрэдным чынам звязаны з глыбіннымі характарыстыкамі чалавечай асобы і таму адлюстроўвае яе месца ў пэўным часе, у дачыненні да прыроднага быцця і яго ўспрыманні. Пейзажны жывапіс неаддзельны і ад асобы мастака Кастуся Качана. Яго пейзажы ўвабралі ў сябе пачуццё месца і часу, яны развіваюць патрыятычныя настроі, вызначаючы лірычны лад твораў і наша адзінства з тым, што адлюстроўвае мастак («Зямля мая, зямля маіх продкаў», 1984; «Поле», 1998). Пры гэтым высокая якасць пейзажнага жывапісу аўтара надае пераканаўчасць мастацкаму вобразу і глыбей выяўляе змест работ. Склад характару Кастуся Качана стрыманы, засяроджаны, нешматслоўны і няспешны, падобны да тых матываў, якія ўвасоблены на яго палотнах. Ён, як і ўсе мастакі, любіць працаваць адзін, у цішы майстэрні або на пленэры, сам-насам з прыродай. Яму блізкая наша ціхая і някідкая беларуская прырода. Наваградчына — край гістарычны, з багатай культурнай спадчынай — асабліва блізкая і дарагая мастаку. Ён любіць прыроду гэтых мясцін, як ніхто разумее іх своеасаблівасць і, пастаянна працуючы з натуры, змог увасобіць гэта ў маляўнічых палотнах («Наваградак зімой», 1988; «Базарны дзень у Наваградку», 1990; «Наваградак», 1990; «Зіма ў Наваградку», 1991; «Вечнасць», 1988).

Для Кастуся Качана малая радзіма — гэта не толькі месца, дзе ён нарадзіўся, правёў дзяцінства, дзе пахаваны яго продкі, а перш за ўсё яго і нічыя больш кропка на зямлі, дзе няма патрэбы даказваць, што ты свой, дзе ўсё знаёма і напоўнена памяццю. Малая радзіма — тое, што надае сілы, своеасаблівы маральны камертон тваіх учынкаў. Малая радзіма — гэта правінцыя, вёска, вуліца горада. Дэмаграфічныя перамены, якія адбыліся ў XX ст., калі пачалася масавая міграцыя ў гарады, шмат у чым і зрабілі тэму малой радзімы адным з галоўных напрамкаў нашага выяўленчага мастацтва.







Мастак працуе ў станковым жывапісе ў жанрах нацюрморта і пейзажа. Творы зберагаюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва Рэспублікі Беларусь, Мастацкім фондзе Міністэрства культуры Расіі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Беларускім музеі народнай архітэктуры і побыту, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Магілёўскім мастацкім музеі імя П. В. Масленікава, Полацкай карціннай галерэі, Доме-музеі Адама Міцкевіча ў горадзе Навагрудку, Музеі гісторыі горада Мінска, Нацыянальным мастацкім музеі горада Чунцын у Кітаі, у прыватных калекцыях Германіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Чэхіі, Сербіі, Аўстрыі, Францыі, Італіі, ЗША, Турцыі, Паўднёвай Карэі, Кітая, В'етнама, Мексікі і інш.

## ВЫСТАВЫ

**1980** Выстава маладых мастакоў Беларусі. Палац мастацтва. Мінск.
**1982** «Маладосць краіны». Залы Акадэміі мастацтваў. Ленінград.
**1983** «Мастацтва маладых мастакоў СССР». Усесаюзная мастацкая выстава. Цэнтральны дом мастака (ЦДМ). Масква.
**1984** «Зямля і людзі». Усесаюзная мастацкая выстава. ЦДМ. Масква.
Выстава твораў маладых мастакоў СССР. Германія, Фінляндыя, Югаславія, В'етнам.
**1986** Персанальная выстава. Дом работнікаў мастацтва. Мінск.
**1991** Персанальная выстава. Рэспубліканская карцінная галерэя. Мінск.
**1992** Персанальная выстава. Выставачная зала БСМ. Гродна.
**1993** Персанальная выстава. Дом работнікаў мастацтва. Мінск.
**1994** Персанальная выстава. Галерэя «Warmsen». Міндан. Германія.
**1997** Выстава пейзажа беларускіх і расійскіх мастакоў. Палац мастацтва. Мінск. ЦДМ. Масква.
**1998** Персанальная выстава. Галерэя «Мастацтва». Мінск.
**2000** Юбілейная персанальная выстава. Рэспубліканская мастацкая галерэя. Палац мастацтва. Мінск.
**2001** Персанальная выстава. Выставачная зала Міністэрства замежных спраў. Мінск.
Персанальная выстава. Галерэя «Золото». Мінск.
**2002** Персанальная выстава. «Галерэя Тызенгаўза». Гродна.
**2003** Персанальная выстава. Галерэя «EL». Эльблонг. Польшча.
**2004** Персанальная выстава. Галерэя «Мастацтва». Мінск.
Персанальная выстава. Дом-музей Адама Міцкевіча. Навагрудак.
**2006** Персанальная выстава. Галерэя «ЛаСандр арт». Мінск.
Персанальная выстава. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мінск.
**2007** Выстава сучасных беларускіх і расійскіх мастакоў. Музей гісторыі Расіі. Масква.
Персанальная выстава. Залы Пасольства Рэспублікі Беларусь. Вашынгтон. ЗША.
Персанальная выстава. Міжнародны гандлёвы цэнтр імя Рональда Рэйгана. Вашынгтон. ЗША.
**2008** Сумесная з Л. Шчамялёвым выстава падчас дзён культуры Беларусі ў Латвіі. Выставачныя залы мэрыі горада Рыга. Латвія.
«Радзімаю зачараваны». Персанальная выстава. Галерэя «Мастацтва». Мінск.
**2009** «Milenium». Рэспубліканская мастацкая выстава. Палац мастацтва. Мінск.
Персанальная выстава. Галерэя «Мастацтва». Мінск.
**2010** «Зямля пад белымі крыламі». Рэспубліканская мастацкая выстава. Палац мастацтва. Мінск.
**2011** «Я не самотны...» Рэспубліканская мастацкая выстава, прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Палац мастацтва. Мінск.
**2012** Рэспубліканская мастацкая выстава, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Палац мастацтва. Мінск.
Выстава беларускіх мастакоў 1980–1990-х гг. Флёрус, Эно. Бельгія.
**2013** Персанальная выстава. Галерэя «Мастацтва». Мінск.
Мастацкая выстава, прысвечаная Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Штаб-кватэра ЮНЕСКА. Парыж. Францыя.
**2014** «Фарбы жыцця». Персанальная выстава. Галерэя «Крыга». Гродна.
«Духоўнае святло». Персанальная выстава. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мінск.
Персанальная выстава. Галерэя «Art». Стакгольм. Швецыя.
**2016** Выстава беларускіх мастакоў у горадзе Чунцын. Кітай.
**2018** «Правінцыя». Выстава. Карцінная галерэя Міхаіла Савіцкага. Мінск.
Выстава ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў. Мінск.



**На возеры Літоўка каля Навагрудка. Злева направа: унучка Сафія, дачка Наста, Кастусь Качан, жонка Жана і сын Ігнат (фота І. Качана)**

On Lake Litoŭka near Navahrudak. From left to right: granddaughter Safija, daughter Nasta, Kastuś Kačan, wife Žana, son Ihnat (photo by I. Kačan)

На озере Литовка около Новогрудка. Слева направо: внучка София, дочка Настя, Кастусь Качан, жена Жанна и сын Игнат (фото И. Качана)

The artist works in such genres of easel painting as still-life and landscape. The works are stored in the National Art Museum of the Republic of Belarus, the Museum of Modern Fine Art of the Republic of Belarus, in the art collection of the Ministry of Culture of the Russian Federation, collections of the Belarusian Union of Artists, in the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle, Hrodna State Historical and Archeological Museum, in the Mahilioŭ Art Museum named after P. V. Maslienikaŭ, Polack Art Gallery, Adam Mickievič memorial-house in Navahrudak, in the Museum of History of Minsk, Art Museum of the town of Chongqing in China, in private collections in Germany, Poland, Lithuania, Latvia, Estonia, Czech Republic, Serbia, Austria, France, Italy, USA, Turkey, South Korea, China, Vietnam, Mexico and other countries.

## EXHIBITIONS

**1980** The Exhibition of young artists of Belarus. Palace of Art. Minsk.
**1982** "Youth of the country". The halls of the Academy of Arts. Leningrad.
**1983** "Art of the young artists of the USSR". All-union art exhibition. Central House of Artist (CHA). Moscow.
**1984** "Land and people". All-union art exhibition. CHA. Moscow.
The exhibition of works of the young artists of the USSR. Germany, Finland, Yugoslavia, Vietnam.
**1986** Personal exhibition. House of Art Workers. Minsk.
**1991** Personal exhibition. Republican Picture Gallery. Minsk.
**1992** Personal exhibition. Exhibition Hall of the BUA. Hrodna.
**1993** Personal exhibition. House of Art Workers. Minsk.
**1994** Personal exhibition. "Warmsen" gallery. Minden. Germany.
**1997** The exhibition of landscape painting of Belarusian and Russian artists. Palace of Art. Minsk. CHA. Moscow.
**1998** Personal exhibition. Art gallery "Mastactva". Minsk.
**2000** The anniversary personal exhibition. National Art Gallery. Palace of Art. Minsk.
**2001** Personal exhibition. Exhibition Hall of the Ministry of Foreign Affairs. Minsk.
Personal exhibition. "Zoloto" gallery. Minsk.
**2002** Personal exhibition. "Tyzenhaŭs gallery". Hrodna.
**2003** Personal exhibition. "EL" gallery. Elblag. Poland.
**2004** Personal exhibition. Art gallery "Mastactva". Minsk.
Personal exhibition. Adam Mickievič memorial-house. Navahrudak.
**2006** Personal exhibition. "LaSandr art" gallery. Minsk.
Personal exhibition. The National Art Museum of the Republic of Belarus. Minsk.
**2007** The exhibition of modern Belarusian and Russian artists. The Museum of History of Russia. Moscow.
Personal exhibition. The halls of the Embassy of the Republic of Belarus. Washington. USA.
Personal exhibition. Exhibition halls of Ronald Reagan Building and International Trade Center. Washington. USA.
**2008** Joint exhibition with L. Ščamialioŭ during Belarus culture days in Latvia. Exhibition halls of Riga Town Hall. Latvia.
"Fascinated by Motherland". Personal exhibition. Art gallery "Mastactva". Minsk.
**2009** "Milenium". Republican art exhibition. Palace of Art. Minsk.
Personal exhibition. Art gallery "Mastactva". Minsk.
**2010** "The Land under the White Wings". Republican art exhibition. Palace of Art. Minsk.
**2011** "I am not alone..." Republican art exhibition dedicated to 120th anniversary of the birth of Maksim Bahdanovič. Palace of Art. Minsk.
**2012** Republican art exhibition dedicated to 130th anniversary of the birth of Janka Kupala and Jakub Kolas. Palace of Art. Minsk.
The exhibition of Belarusian artists of 1980—1990s. Fleurus, Hainaut. Belgium.
**2013** Personal exhibition. Art gallery "Mastactva". Minsk.
Art exhibition dedicated to the Independence Day of the Republic of Belarus. UNESCO headquarters. Paris. France.
**2014** "Colours of life". Personal exhibition. "Kryha" gallery. Hrodna.
"Light of soul". Personal exhibition. The National Art Museum of the Republic of Belarus. Minsk.
Personal exhibition. "Art" gallery. Stockholm. Sweden.
**2016** The exhibition of Belarusian artists in the town of Chongqing. China.
**2018** "Province". Personal exhibition. Michail Savicki Art Gallery. Minsk.
The exhibition in Republican Palace of Culture of Trade Unions. Minsk.

БІБЛІЯГРАФІЯ
**Кнігі, каталогі, энцыклапедыі і даведнікі**

BIBLIOGRAPHY
**Books, catalogues, encyclopedias and reference books**

БИБЛИОГРАФИЯ
**Книги, каталоги, энциклопедии и справочники**


**Искусство молодых художников. Живопись, графика, скульптура** : альбом / НИИ теории и истории изобраз. искусств АН СССР ; авт.-сост. и авт. вступ. ст. В. П. Сысоев. — М. : Изобразительное искусство, 1988.

**Качан Кастусь. Жывапіс** : каталог / аўт. уступ. арт. Я. Карловіч. — Мінск, 1995.

**Мая зямля. Жывапіс беларускіх мастакоў** : альбом / уклад. і аўт. уступ. арт. В. Трыгубовіч. — Мінск, 1996.

**Беларускі саюз мастакоў** : энцыклапед. даведнік / аўт.-склад. Б. А. Крэпак [і інш.]. — Мінск : Кавалер Паблішэрс, 1998.

**Беларуская энцыклапедыя** : у 18 т. / рэдкал. : Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1996–2003. — Т. 8 : Канто — Кулі / Г. Пашкоў [і інш.]. — 1999.

Жук, В. И. **Кастусь Качан** / В. И. Жук // Природа Беларуси : альбом пейзажной живописи / Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды. — Минск : И. П. Логвинов, 2004.

**Кастусь Качан = Kastuś Kachan** : жывапіс / Беларускі саюз мастакоў ; аўт. уступ. арт. Я. Карловіч. — Мінск, 2004.

**Музей сучаснага выяўленчага мастацтва = Museum of Modern Fine Arts** / склад. Н. Зелянко, Н. Шаранговіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2006.

**Салон ЦДХ – 2007** : каталог / сост. и ред. М. Карлова. — М. : ПранатПреПресс, 2007.

**Мастацтва Беларусі = Искусство Беларуси = Belarusian Art** : альбом / Беларускі саюз мастакоў ; уступ. арт. А. Белявец. — М. : Галарт, 2010.

**Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе = Современная белорусская живопись. XXI век = Modern Belarusian Painting. XXI century** : альбом / склад., пер. на бел. мову К. С. Аксёнаў, пер. на англ. мову С. В. Місюк. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2010.

**Искусство начинается с чуть-чуть** : каталог к выставке произведений из частных коллекций в Национальном художественном музее Республики Беларусь. — Минск, март 2012.

Жук, В. И. **Живопись Беларуси на рубеже веков: потери и обретения** / В. И. Жук. — Минск : Беларуская навука, 2013.

**Мастацтва суверэннай Беларусі = Искусство суверенной Беларуси = The Art of Sovereign Belarus** : альбом / склад. К. В. Ізафатава [і інш.] ; пер. на англ. мову: Т. А. Асадчанка, А. Д. Стралкоўская. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016.




**На пчальніку ў Лаўрышаве (фота І. Качана)**

In the beegarden in Laŭryšava (photo by I. Kačan)

На пасеке в Лавришево (фото И. Качана)

## Артыкулы ў перыядычным друку
## Articles in periodical press
## Статьи в периодической печати


Пикулик, Е. **Дарю вам мир, и дом, и красоту** / Е. Пикулик // Знамя юности. — 1986. — № 240.

Буйвал, В. **Вытокі натхнення** / В. Буйвал, М. Паграноўскі // Мастацтва Беларусі. — 1989. — № 2. — С. 60–61.

Кошур, С. **Адвечныя фарбы жыцця** / С. Кошур // Полымя. — 1989. — № 108.

Nikolaev, A. **La fiente de inspiracion de Kastuś Kachan es su natal Novogrudok** / A. Nikolaev // Голас Радзімы. — 1989. — № 40.

Качан, А. **Голубая весна Кастуся Качана** / А. Качан // Перспектива. — 1991. — № 19.

Коктыш, А. **Якi цудоўны гэты свет, паглядзі...** / А. Коктыш // Добры вечар. — 1991. — № 112.

Серафімава, Л. **Якога колеру жыццё** / Л. Серафімава // Народная газета. — 1991. — № 178.

Цімошык, Л. **Зямля мая, зямля маіх продкаў** / Л. Цімошык // Знамя юности. — 1991. — № 167.

Аблажэй, А. **Ціхая праўда** / А. Аблажэй // Мастацтва. — 1992. — № 3. — С. 57—58.

Лецка, Я. **Святло старажытнай зямлі** / Я. Лецка // ЛіМ. — 1994. — 1 красавіка. — С. 11.

Ломсадзе, Л. **Жил-был художник один...** / Л. Ломсадзе // СБ. — 1994. — № 32–33.

Каранеўскі, І. **Шлях Кастуся Качана** / І. Каранеўскі // Книжный мир. — 2000. — № 9.

Паўлаў, М. **Цяпло роднай зямлі** / М. Паўлаў // Новае жыццё. — 2000. — 7 сакавіка.

Попова, В. **Вдруг стало тихо** / В. Попова // СБ. — 2000. — 30 сентября.

Штейнман, А. **Вода, земля и небо Кастуся Качана** / А. Штейнман // Вечерний Минск. — 2000. — № 191.

Кавалёў, У. **Жытнёвае поле і замак суровы** / У. Кавалёў // Краязнаўчая газета. — 2001. — № 7. — С. 8.

Павленко, Н. **Позвольте быть вам верным** / Н. Павленко // Вечерний Гродно. — 2001. — 25 апреля — 2 мая. — С. 4.

Голуб, Ю. **Спавіты Навагрудчынай** / Ю. Голуб // Культура. — 2004. — 17 лістапада.

Вяршыцкая, Т. **Яго зямля, наша зямля** / Т. Вяршыцкая // Новае жыццё. — 2006. — 6 снежня.

Гаранская, Т. **Існасць** / Т. Гаранская // Культура. — 2006. — 28 кастрычніка — 3 лістапада. — С. 7.

Катляроў, І. **Адухоўленая сувязь** / І. Катляроў // Ранак плюс. — 2006. — № 23.

Шаранговіч, Н. **Выверaная танальнасць** / Н. Шаранговіч // Мастацтва. — 2007. — № 1. — С. 46–51.

Taubvurtzel, L. **Belarussian artist Kastuś Kachan** / L. Taubvurtzel // Russian-American Business. — 2007.

Архипов, И. **Очарованный Родиной** / И. Архипов // Белорусская военная газета. — 2008. — 21 марта. — С. 3.

Гаранская, Т. **Рака часу** / Т. Гаранская // Мастацтва. — 2010. — № 4.

Кароль, Д. **Прызванне — жывапіс** / Д. Кароль // ЛіМ. — 2013. — № 4.

Мятлік, К. **Яго абрала зямля Навагрудская** / К. Мятлік // Новае жыццё. — 2013. — № 56.

Бесараб, К. **Не хлебам адзіным** / К. Бесараб // Новае жыццё. — 2014.

Свірко, І. **Галерэя каля Замкавай гары** / І. Свірко // Рэспубліка. — 2014. — 6 красавіка.

Свірын, І. **«Прыватны выпадак» прыватнай галерэі** / І. Свірын // Культура. — 2014. — № 29.

Svirko, I. **The Estate of Artist Konstantin Kachan — opened it's doors to visitors** / I. Svirko // СБ. — 2014. — 18 апреля.

Пісар, В. **Свята мастацтва** / В. Пісар // Новае жыццё. — 2015. — 24 чэрвеня.

Юдина, И. **Скромное обаяние провинции** / И. Юдина // Минский курьер. — 2015. — 29 апреля. — С. 23.

Степан, В. **Однажды снежной зимой** / В. Степан // СБ. — 2016. — № 125.

Кур'ян, Н. **Пясняр беларускіх мястэчак** / Н. Кур'ян // Новае жыццё. — 2017. — № 1. — С. 6–7.

Васілёк, Я. **На сваёй малой радзіме — Навагрудчыне мастак Кастусь Качан стварыў галерэю** / Я. Васілёк // СБ. — 2018. — 4 мая.

Гардзей, А. **Любоў да месца, з якім звязаны** / А. Гардзей // Звязда. — 2018. — № 85.

Камінская, Л. **Спавядаюцца фарбы...** / Л. Камінская // Наша вера. — 2018. — № 3.

Корнеева, Н. **Нам помогал Бог и вся Вселенная: в центре Новогрудка семья столичного художника открыла свою галерею** / Н. Корнеева // Вечерний Гродно. — 2018. — 27 июня.

Пісар, В. **Малая радзіма — мая любоў** / В. Пісар // Новае жыццё. — 2018. — № 34.

Чэмер, М. **Любіць зямлю, любіць людзей...** / М. Чэмер // Настаўніцкая газета. — 2018. — № 51.

Навукова-папулярнае выданне

**Кастусь Качан**
**Жывапіс**
Kastuś Kačan
Painting
Кастусь Качан
Живопись

Укладальнік **Качан** Канстанцін Іванавіч
На беларускай, англійскай і рускай мовах

Рэдактар Н. А. Галкоўская
Мастацкае афармленне З. Э. Герасімовіча
Пераклад на англійскую мову Г. І. Самасейкі
Мастацкі рэдактар В. Г. Загародні
Тэхнічны рэдактар Ж. М. Бароўская
Карэктары В. І. Смірнова, Г. І. Самасейка

12+

Падпісана да друку 27.03.2019. Фармат 60×100 1/8. Папера мелаваная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 26,6. Ул.-выд. арк. 20,5. Тыраж 700 экз.
Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.